ISSN 2079-1488

# STUDIA HISTORICA EUROPAE ORIENTALIS



# ИССЛЕДОВАНИЯ ПО ИСТОРИИ ВОСТОЧНОЙ ЕВРОПЫ

ВЫПУСК 15

ISSN 2079-1488

ГОСУДАРСТВЕННОЕ УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ
«РЕСПУБЛИКАНСКИЙ ИНСТИТУТ ВЫСШЕЙ ШКОЛЫ»

КАФЕДРА ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ БЕЛАРУСИ

# STUDIA HISTORICA EUROPAE ORIENTALIS

# ИССЛЕДОВАНИЯ ПО ИСТОРИИ ВОСТОЧНОЙ ЕВРОПЫ

Научный сборник

*Основан в 2008 году*

**ВЫПУСК 15**

Минск
РИВШ
2022

УДК 94(4-11)(082)

Р е к о м е н д о в а н о
редакционно-издательской комиссией
государственного учреждения образования
«Республиканский институт высшей школы»
(протокол № 6 от 30 декабря 2021 г.)

Р е д а к ц и о н н а я к о л л е г и я :
***А. В. Мартынюк*** – доктор исторических наук, главный редактор (Минск)
***Г. Я. Голенченко*** – доктор исторических наук, зам. гл. редактора (Минск)
***О. А. Яновский*** – кандидат исторических наук, зам. гл. редактора (Минск)
***А. А. Любая*** – кандидат исторических наук, зам. гл. редактора (Минск)
***М. Вайерс*** – доктор исторических наук (Бонн)
***В. А. Воронин*** – кандидат исторических наук (Минск)
***О. И. Дзярнович*** – кандидат исторических наук (Минск)
***Д. Домбровский*** – доктор исторических наук (Быдгощ)
***Л. В. Левшун*** – доктор филологических наук (Минск)
***А. В. Любый*** – кандидат исторических наук (Минск)
***И. А. Марзалюк*** – доктор исторических наук (Могилев)
***Н. В. Николаев*** – доктор филологических наук (Санкт-Петербург)
***В. А. Теплова*** – кандидат исторических наук (Минск)
***А. Н. Стебурако*** – кандидат исторических наук (Минск)
***В. А. Федосик*** – доктор исторических наук (Минск)
***А. И. Филюшкин*** – доктор исторических наук (Санкт-Петербург)
***В. Янкаускас*** – доктор истории (Каунас)

**Studia** Historica Europae Orientalis = Исследования по истории
И87 Восточной Европы : науч. сб. Вып. 15. – Минск : РИВШ, 2022. – 242 с.

В научном сборнике представлены актуальные исследования белорусских и зарубежных ученых, посвященные широкому кругу проблем истории Восточной Европы в Средние века и раннее Новое время. Сборник включен ВАК Республики Беларусь в перечень научных изданий для опубликования результатов диссертационных исследований по историческим наукам.

Адресуется студентам, аспирантам, преподавателям и научным работникам, а также всем, кто интересуется историей восточных славян.

© Оформление. ГУО «Республиканский
институт высшей школы», 2022

# СОДЕРЖАНИЕ

СТАТЬИ .................................................. 5

*Дзярновіч А. І.*
Калектыўны суіцыд у Антычнасці і Сярэднявеччы:
топасы гісторыяпісання .................................................. 7

*Афанасенко Ю. Ю.*
Теология истории Древней Руси – метод изучения
церковной истории региона .................................................. 24

*Сердюк Б. В.*
Епископ Рейнберн в Туровском княжестве: к вопросу о латинской
церковной иерархии на древнерусских землях .................................................. 31

*Самонова М. Н.*
Династическая политика Всеслава Брячиславича
и именослов его сыновей .................................................. 44

*Кежа Ю. Н.*
Глеб Всеславич и Киево-Печерский монастырь:
место полоцких князей в родовой структуре Рюриковичей .................................................. 55

*Темушев С. Н.*
Исключение полоцких Изяславичей из родового владения
Рюриковичей .................................................. 63

*Подберезкин Ф. Д.*
«Ливонский эпизод» из жизни двух Альбрехтов .................................................. 73

*Лицкевич О. В.*
Малоизвестный источник по истории Завилейской Литвы,
Полоцкой земли и Браславского Поозерья (1388–1391 гг.) .................................................. 88

*Калечиц И. Л.*
Граффити-рисунки в Спасо-Преображенской церкви Полоцка .................................................. 104

*Самусік А. Ф.*
Трансфармацыя праваслаўнай асветы на тэрыторыі Беларусі
ў XIII – пачатку XVII ст. .................................................. 153

*Сцебуракa А. М.*
Ужыванне назвы «Белая Русь» у французскай практыцы ранняга Новага часу ........ 168

*Воробьев П. А.*
Е. Ф. Карский, М. В. Довнар-Запольский и В. И. Пичета о роли наследия Византии в истории Беларуси ........ 175

*Яновский О. А.*
Древнерусская составляющая истории Беларуси в БГУ 1921–1931 гг.: формирование и уничижение научных парадигм ........ 188

ИСТОЧНИКИ ........ 195

*Дедук А. В., Шеков А. В.*
Актовые источники по истории полоцких средневековых монастырей из фонда 1603 Российского государственного архива древних актов (РГАДА) ........ 197

НАУЧНАЯ ЖИЗНЬ ........ 213

*Кежа Ю. Н.*
Древняя Русь как исчезающая Атлантида: Международная научная конференция «Русь – Белая Русь – Беларусь: история, наследие, память» (Минск, 23–24 июня 2022 г.) ........ 215

*Мартынюк А. В.*
«Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы» в 2008–2023 гг.: некоторые итоги и размышления ........ 222

СВЕДЕНИЯ ОБ АВТОРАХ ........ 228

РЕЗЮМЕ ........ 231

SUMMARY ........ 237

*Дзярновіч А. І.*

# КАЛЕКТЫЎНЫ СУІЦЫД У АНТЫЧНАСЦІ І СЯРЭДНЯВЕЧЧЫ: ТОПАСЫ ГІСТОРЫЯПІСАННЯ

У наратывах такіх сацыяльна-гуманітарных катастроф, як войны ці грамадзянскія закалоты, адным з найбольш моцных вобразаў ствараецца пры дапамозе апісання ў антычным і сярэднявечным гісторыяпісанні выпадкаў калектыўнага суіцыду. У гэтых падзеях канцэнтруецца ўзровень псіхалагічнай і мілітарнай напружанасці. Але варта зразумець, ці быў сюжэт з калектыўным самагубствам «вандроўным»? Ці ўтварыліся характэрныя прыёмы трансляцыі падобнай інфармацыі на ўзроўні характэрных літаратурных метафараў і гіпербалаў? Раскрыццё гэтых пытанняў і ёсць задачай дадзенага даследавання. Аналіз матэрыялу будзе праводзіцца на базе крыніц, які маюць дачыненне да гісторыі Вялікага Княства Літоўскага ці цытуюцца яго гістарыёграфамі і летапісцамі, і былі, такім чынам, вядомыя аўтарам і кніжнікам ВКЛ.

### 1. Пілены

Найбольш яскравы выпадак калектыўнага суіцыду на тэрыторыях, якія складуць ВКЛ, быў апісаны ў «Новай Прускай хроніцы» Віганда з Марбурга. У 1336 г. пад час рэйду ордэнскага аддзела на чале з вялікім магістрам Дзітрыхам фон Альтэнбургам (з роду бургграфаў Альтэнбургу; вялікі магістр 3.V.1335–6.X.1341) адбыўся штурм замку (гарадзішча) Пілены. Кіраванне вялікага магістра Дытрыха было адметным тым, што ён прыцягнуў у дапамогу Ордэну новыя сілы рыцараў-візіцёраў з Цэнтральнай і Заходняй Еўропы: аддзелы герцага Брандэнбургскага, графаў з Фландрыі, Францыі, іншых германскіх і аўстрыйскіх зямель. Узімку 1335–1336 гг. агульная колькасць гэтых добра ўзброеных «гасцей» дасягала звыш 200 шаломаў (*galea*) [31, s. 196].

Паводле Хронікі Вігшанда з Марбургу, аб'яднаныя ордэнскія аддзелы 25 лютага 1336 г. выправіліся на Літву і ўзялі ў аблогу «castrum Pillenen in terra Troppen». Як можна зразумець, гэты «замак Піленай» у «зямлі Тропен» быў важным апорным пунктам у Жамойці, на мяжы з ужо заваяванай Ордэнам Прусіі. Зямля Тропен, таксама як і замак Піленай, не маюць дакладнай лакалізацыі. Мяркуецца, што яны знаходзіліся на паўночным (правым) беразе ніжняга Нёмана.

pawet.net

Паводле Віганда з Марбургу да Піленай збеглася звыш 4000 чалавек з чатырох зямель. Пабачыўшы ордэнскае войска, язычнікі «згубілі надзею на ўтрыманне замку» і пакідалі сваю маёмасць у полымя. Затым адбыўся акт калектыўнага суіцыду. Драматызму нарацыі надае аповед пра «vetula pagana» («старую паганку»), якая сякерай забіла 100 сваіх супляменнікаў, а потым забіла сама сябе. У рамантычнай гістарыяграфіі гэты вобраз быў праінтэрпрэтаваны як «вядунья».

Граф Гененберг узяў пад кантроль замак, але частка абаронцаў, параненыя, здолелі сысці на конях. Правадыр паганцаў, якога хроніка называе «Rex Lithwanorum», быў абаронены тарчамі сваіх слугаў. «Ахоплены страхам» ён уцёк да нейкай хованкі, дзе закалоў сваю жонку і ўкінуў яе цела ў агонь. Паганцы ж, ураджаныя такой паразай, схілілі свае галовы і былі забітыя сваім правадыром (іл. 1). «Castrum Polenen» быў разбураны, і з яго былі выведзены палонныя ды багатая здабыча [31, s. 198].

Базавыя звесткі пра падзеі пад Піленай першым зафіксаваў, з таго што на сёння вядома, храніст Віганд з Марбурга (каля 1365–1394/1409). Сам Віганд не з’яўляўся рыцарам Ордэна, але быў герольдам вялікага магістра Конрада Валенрода (1391–1393). Хроніка Віганда ахоплівае перыяд ад 1293 па 1394 гады і з’яўляецца адной з найважнейшых крыніц па гісторыі Нямецкага ордэна ў Прусіі. Першапачатковы тэкст хронікі быў напісана рыфмаванай прозай на сярэдневерхненямецкай мове (*vulgari teutonico*).

У сярэдзіне XV ст. з ініцыятывы польскага гістарыёграфа і каралеўскага прыдворнага Яна Длугаша (1415–1580) быў зроблены лацінскі пераклад хронікі. Ужо ў XV ст., пасля з’яўлення лацінскага перакладу хронікі Віганда з Марбургу, пачынаецца цыркуляцыя і інтэрпрэтацыі звестак з гэтага твору. Першым да аблогі Піленаў звярнуўся Ян Длугаш, на замову якога і рабіўся лацінскі пераклад «Новай прускай хронікі».

Але найважнейшую трансфармацыю, якую ажыццявіў Ян Длугаш у сваёй нарацыі пра штурм замку Пілены, гэта наданне этнічных маркераў удзельнікам падзей. У Віганда з Марбургу супольнасць, што супрацьстаяла Ордэну, пазначалася як «паганцы/язычнікі» (*pagani*). У тэксце ж Яна Длугаша яны сталі пазначацца як літоўцы (*lithwani*). У самога Віганда толькі адзін раз сам правадыр акрэсліваецца як «Rex Lithwanorum». Відавочна, што Длугаш сыходзіў з уяўленняў XV ст., калі ВКЛ знаходзілася ў персанальнай уніі з Каронай Польскай і мог дазволіць сабе мадэрнізацыю аповеду. Можна меркаваць, што ў гэтым жа

мадэрнізацыйным кірунку знаходзіцца і трансфармацыя актараў працэсу калектыўнага суіцыду ў Піленах – у Віганда з Марбургу гэта была найперш «старая язычніца» (вядунья?) з рытульнай (?) сякерай, у Яна Длугаша – ужо толькі правадыр замка. Такім чынам, у Яна Длугаша аднначасова назіраюцца тэндэнцыя «дэпаганізацыі» (ці «хрысціянізацыі») і гераізацыі паведамленняў пра падзеі пад Піленамі.

Традыцыя гісторыяпісання ВКЛ пра Пілены вядзе свой пачатак ад прац Мацея Стрыйкоўскага. Першым творам Стрыйкоўскага, у якім распавядаецца пра гэты сюжэт, стала польскамоўная хроніка «O początkach, wywodach, dzielnościach, sprawach rycerskich i domowych sławnego narodu litewskiego, żemojdzkiego i ruskiego», выкладзеная ў вершаванай і празаічнай форме.

Але найбольш фундаментальныя змены ў прынцыпах выкладання матэрыялу адбыліся праз прамыя спасылкі Мацеем Стрыйкоўскім на крыніцы сваёй інфармацыі. Храніст не толькі ўказаў імёны сваіх папярэднікаў і спаслаўся на аркушы публікацый, але даў шырокія цытаты з лацінскіх прац Марціна Кромера і Мацея Мяхоўскага. Спасылаючыся на Кромера Стрыйкоўскі ўказаў наступны аркуш: fol. 203, lib. 12. Бібліялагічны аналіз паказвае, што гэта было другое выданне хронікі Кромера, якое выйшла ў свет у 1568 г. [22]. Мяхоўскага Стрыйкоўскі цытаваў паводле рэдагаванага (цэнзураванага) выдання 1521 г. [26, p. 234]. Аднак у глосе Стрыйкоўскі пазначыў f. 233, у той час як пры цытаванні зрабіў правільную спасылку на fol. 234.

Таксама надзвычай важная навацыя Стрыйкоўскага – гістарыёграф ВКЛ уключыў падзеі пад Піленамі ў сусветны гістарычны кантэкст, спасылаючыся на антычную і персідскую гісторыю: «Tej się cnocie sam Kromer, litewskiej dziwuje, / A każdy mądry dziwnie ich stałość szacuje. / Iż greków i rzymianów, Persów swą dzielnością / Przewyższyli i w śmierci śmiałą upornością».

**2. Замак Тале і Югурцінская вайна**

Праз пяць год пасля напісання «O początkach» была апублікаваная галоўная праца Мацея Стрыйкоўскага «Kronika polska, litewska, żmódzka y wszystkiey Rusi». У гэтым творы храніст у больш шырокай версіі падаў сваю інфармацыю пра Пілены.

Але найбольш значныя навацыі былі прыўнесены Стрыйкоўскім у стварэнні сусветнага кантэксту падзеі. Цяпер аўтар спасылаўся ўжо не толькі на сваіх папярэднікаў-храністаў Марціна Кромера і Мацея Мяхоўскага, але таксама на не названыя прускія хронікі і таксама на

прыклады з антычнай гісторыі, зрабіўшы канкрэтныя адсылкі да старажытных аўтараў.

Найбольш падрабязна Стрыйкоўскі спасылаўся на працу рымскага гісторыка Салюсція (*Gaius Sallustius Crispus*) «Югурцінская вайна» (*«Bellum Iugurthinum»*), у якой апісваліся падзеі вайны 112–105 гг. да н. э. паміж Рымам і паўночна-афрыканскім нумідзійскім царом Югуртам. У гэтым гістарычным творы Стрыйкоўскі знайшоў паралелі паміж штурмам Піленаў і аблогай замка Тале: «Taką też drugą przeważność oblężonych Numidow naydziesz u Salustius za de bello Jugurtino y u Liviussa, gdy pod nimi Metellus usilnie dobywał zamku Talle, gdzie także numidowie, widząc mury porozbijane, wszystki skarby od złota y srebra, ktore bardzo wielkie były, do iednego pałacu krola swego Jugurti znosiwszy, a sami się winem popiwszy, wszystkie rzeczy y samych siebie zapalili» [29, p. 16–17].

Горад Тала (*Thala*) быў адной з тых рэзідэнцый, дзе захоўваўся скарб цара Югурты. Пасля паразы, панесенай ад рымскага палкаводца Метэлы, Югурт схаваўся ў Сахары, а горад быў узяты ў аблогу рымскімі войскамі. Але праз сорак дзён аблогі рымляне авалодалі толькі самім горадам, але не нумідзійскімі багаццямі. Паводле Салюсція, пабачыўшы, што гарадскі мур разбіваюць таранамі, верныя Югурце гараджане перанеслі золата і срэбра ў царскі палац, там «напіўшыся і наеўшыся», яны кінулі ў агонь царскія скарбы ды падпалілі палац, добраахвотна аддаўшы сябе смерці, згарэўшы самі: «[5] denique Romani, multo ante labore proeliisque fatigati, post dies quadraginta quam eo ventum erat, oppido modo potiti; praeda omnis ab perfugis corrupta. [6] ii postquam murum arietibus feriri resque suas adflictas vident, aurum atque argentum et alia, quae prima ducuntur, domum regiam conportant. ibi vino et epulis onerati illaque et domum et semet igni corrumpunt, et, quas victi ab hostibus poenas metuerant, eas ipsi volentes pependere» [28, гл. 76: 5, 6; 14, гл. 76: 5, 6].

Як відаць з вышэй прыведзенай цытаты, у пошуках антычных аналогій Стрыйкоўскі спасылаўся таксама на Лівія. Але і больш блізкія тэрытарыяльна і храналагічна падзеі нагадвалі гістарыёграфу эпізод з Піленамі, у прыватнасці, з асманскай экспансіяй у Еўропе і наступам на Венгрыю: «Toż też naszych czassow Węgrowie na Segećie y Dziule uczynili, gdy ich Soliman, cesarz Turecki, dobywał». Апісанне падзей 1336 г. пад Піленамі на шырокім фоне антычнай і познесярэднявечнай еўрапейскай гісторыі стала несумненным дасягненнем Мацея Стрыйкоўскага як гістарыёграфа.

**3. Масада**

Але адзін з эпізодаў калектыўнага суіцыду ў сусветнай гісторыі, на які не спасылаліся ордэнскія храністы, а таксама гістарыёграфы Польшчы і ВКЛ, стаў найбольш класічным прыкладам падобных масавых дзеянняў, які ў пэўным сэнсе стаў пазначаць саму з'яву. Мова ідзе пра абарону старажытнай фартэцыі на гары Масада, узведзенай яшчэ царом Ірадам Вялікім у 25 г. да н. э. на заходнім беразе Мёртвага мора.

Пад час антырымскага паўстання, вядомага як Першая Іўдзейская вайна (66–73 гг. н. э.), Масада была занятая паўстанцамі-зілотамі, якія лічылі прыдатнымі любыя сродкі для звяржэння эліністычных уплываў і рымскага панавання ў Іўдзеі. Урэшце рэшт фартэцыя засталася пад кантролем яшчэ больш радыкальнай секты сікарыяў («кінжальнікаў») – баявой групоўкі, якая адкалолася ад зілотаў ды стала на шлях прамых нападаў і тэрарыстычных актаў.

Падзеі вакол Масады разгарнуліся ўжо на фінішнай стадыі вайны і абложаныя ў фартэцыі, падобна што, уяўлялі сабой апошнюю больш менш буйную групоўку паўстанца. Рымскія войскі распачалі аблогу фартэцыі ў 73 г., альбо, паводле іншых дадзеных, у 74 г. н.э. [20, S. 157–162]. Вайсковай аперацыяй камандаваў новапрызначаны пракуратар Іўдзеі Люцы Флаві Сільва, які меў у сваім распараджэнні X легіён (*Legio X Fretensis Antoniniana Pia Fidelis)*.

У сувязі з тым, што Масада знаходзілася на аднаасобным пагорку (гары) і мела значныя запасы для знаходжання ў аблозе, пракуратарам быў абраны радыкальны і працаёмісты план аблогі і штурму. Вакол гары Масада быў пабудаваны аблогавы вал, пляцоўкі для мятальных машын і штурмавы пандус для тарану (іл. 2). Нягледзячы на тое, што рымлянам прыйшлося разгарнуць складаную сістэму абложных збудаванняў, як паказваюць найноўшыя даследаванні Джонатана Рота, задача ўзяцця фартэцыі патрабавала «простага прымяненне рымскай ваеннай тэхнікі невялікімі правінцыйнымі сіламі» на працягу тэрміна ад 4 да 9 тыдняў [27, p. 109–110]. Дзякуючы падведзенаму тарану была прабітая знешняя сцяна фартэцыі, за якой знаходзілася дадатковая абарончая сцяна, пабудаваная сікарыямі з драўляных бэлек.

Лёс Масады быў вырашаны. Правадыр паўстанцаў Элазар бэн Яір звярнуўся да сікарыяў з палымянай прамовай. Паводле аўтара класічнага гастарыяграфічнага твору «Іўдзейская вайна», канфарміста і інтэлектуала Іосіфа Флавія, Элазар бэн Яір заклікаў паўстанцаў загінуць свабоднымі людзьмі:

*«Будзьце мужныя, героі, пакрыйце сябе славай!... Не аддамо жа сябе цяпер добраахвотна ні рабству, ні тым жахлівым пакутам, якія чакаюць нас. Не зганьбіць сябе перад рымлянамі, не здадзімся ім жывымі!... Мы першыя паўсталі супраць іх і апошнімі пакідаем поле бою... Вялікую ласку аказаў нам Бог, даўшы магчымасць памерці смерцю герояў, загінуць свабоднымі людзьмі, чаго не дадзена было здзейсніць нашым братам, паланёным знянацку... Хай нашыя жонкі памруць ня зганьбаванымі і нашы сіроты ня зведаюць горычы рабства. А затым саслужыла адзін аднаму апошнюю службу, акажам апошнюю міласць, і што можа быць, браты, лепш і даражэй ганаровага савана свабоды? Але перш чым памром, аддамо агню нашую маёмасць і крэпасць. Я дакладна ведаю: рымляне пакрыўдзяцца, убачыўшы, што не ўзялі нас жыўцом і ашукаліся ў сваіх спадзяваннях пажывіцца здабычай. Толькі харчовыя запасы пакінем не кранутымі, каб яны сведчылі пасля нашай смерці, што мы не пакутавалі ні ад голаду, ні ад недахопу вады, але самі аддалі перавагу смерць рабству – як і пастанавілі загадзя...»* [7, с. 437–438].

Іосіф Флавій занатаваў успаміны дзвюх жанчын, якія здолелі схавацца ў пячоры і потым распявялі рымлянам, як адбыўся калектыўны суіцыд. Спачатку мужчыны забілі сваіх жонак і дзяцей, затым па жэрабі адзін аднаго:

*«...затым абралі па жэрабі дзесяць чалавек, якім трэба было закалоць астатніх. І кожны распластаўся на зямлі каля сваіх мёртвых жонкі і дзяцей, абхапіўшы рукамі іх цела, і з ахвотай падставіў сваё горла дзесярым, якія выконвалі жахлівы абавязак. Гэтыя людзі без уздрыгу пракалолі мячамі усіх, аднаго за адным. Затым яны кінулі жэрабя паміж сабой, каб той, на каго пакажа лёс, забіў дзевяцярых таварышаў, а затым наклаў рукі і на сябе... Назаўтра падняліся рымляне на Масаду, і калі знайшлі груды забітых, ня ўзрадаваліся пры выглядзе загінулых ворагаў, а толькі застылі ў маўчанні, ўражаныя веліччу іх духу і нязломным пагардай да смерці»* [7, с. 443].

Такі спосаб забойства адзін аднаго быў абраны таму, што рэлігія не ўхваляла самагубства і, па выніках, фактычна толькі адзін з усіх абаронцаў Масады мусіў забраць жыццё ў самога сябе [5, с. 215].

Супастаўленне рымскіх і старажытна-яўрэйскіх крыніц пацвярджае гісторыю пра Масаду. Апроч таго, у нечым нечакана, былі знойдзены археалагічныя пацверджанні трагедыі ў Масадзе. Шматгадовая экспедыцыя пад кіраўніцтвам археолага і былога начальніка Генеральнага штабу Арміі абароны Ізраіля Ігаэля Ядзіна выявіла на гары Масада

пячору з шкілетамі 25 чалавек. Тэарэтычна гэта маглі б быць парэшткі рымскага гарнізону ці манахаў пазнейшага візантыйскага манастыра. Доктар Н. Гас з Медыцынскай школы Яўрэйскага ўніверсітэту вызначыў наступны дэмаграфічна-гендэрны склад памерлых: 14 шкілетаў належалі мужчынам ва ўзросце ад 22 да 60 гадоў; адзін мужчына быў старэйшы за 70 гадоў; 6 жанчын мелі ўзрост ад 15 да 22 гадоў; 4 дзяцей мелі ўзрост ад 8 да 12 гадоў; быў знойдзены таксама адзін эмбрыён. Ігаэля Ядзіна прыйшоў да высновы, што гэты парэшкі належаць абаронцам Масады і іх сем'ям [30, p. 193–197]. Выяўленыя скруткі з тэкстамі, якія маглі быць звязаныя з зілотамі, датуюцца не пазней 73 г. н. э. [30, p. 189].

Цалкам сенсацыйным стала выяўленне ў археалагічных сезонах 1963–1965 гг. адзінаццаці керамічных чарапкоў з напісанымі старажытна-яўрэскімі імёнамі (іл. 3) [30, p. 189–191; 21, p. 224–225]. Сярод гэтых чарапкоў вылучаецца адзін, на якім было нанесенае імя «Бэн Яір», якое, верагодней за ўсё, належала Элізару Бэн Яіру, правадыру зілотаў Масады (іл. 4) [30, p. 201]. Гучыць амаль неверагодна, але гэтыя таблічкі з імёнамі маглі выкарыстоўваліся ў якасці жэрабя дзесяццю выканаўцамі забойства паводле згоды.

Тут неабходна яшчэ адзначыць тое, што абаронцы фартэцыі належалі да экстрэмальнай групоўкі і былі гатовыя пайсці на акт калектыўнага суіцыду. На падобны дзеянні маглі рашыцца не прадстаўнікі маргінальных груповак, а людзі, матываваныя фанатычнай ідэяй [5, с. 207].

### 4. Задача Іосіфа Флавія

#### 4-1. Выпадак у Іатапаты

Але эпізод з Масадай стаў не адзінкавым апісаным Іосіфам Флавіям выпадкаў калектыўнага суіцыду ў Іўдзеі. Больш таго, на грунце не толькі фактаў, але і прагматычных разважанняў Флавія ў матэматыцы ўзнікла традыцыя займальнай задачы, якая патрапіла таксама ў прыёмы навучання сучаснай інфарматыкі. Адна з варыяцый старажытнай задачы носіць імя Іосіфа Флавія.

У Сярэднявеччы гэтая задача мела таксама фармулёўку пра 15 хрысціян і 15 турак, якія патрапілі на борце карабля ў шторм. А ўсходні варыянт гэтай задачы аналізуе шансы атрымаць спадчыну багатага ўладальніка статкаў для 15 яго сыноў ад першага шлюбу і 15 сыноў ад другога шлюбу [2, с. 44].

Паводле Іосіфа Флавія ён меў уласны досвед трагічнага выбару ў амаль безвыходнай сітуацыі. Пад час Іўдзейскай вайны рымляна-

мі на чале з Веспасіянам, пасля 47 тыдняў аблогі 20 ліпеня 67 г. н. э. у Ніжняй Галілеі быў узяты горад Іатапата (элінізаваная назва біблейскага горада Йодфат). Іосіф Флавій у складзе аддзелу з 40 іншымі іўдзейскімі воінамі быў загнаны рымлянамі ў пячору [8, с. 210], выхад з якой быў толькі адзіны – палон. Ваяры аддалі перавагу смерці перад ганьбай палону. Насуперак агульнага настрою, Іосіф палічыў такую смерць бессэнсоўнай і супярэчнай іўдзейскай рэлігійнай традыцыі. Разумеючы пагрозу таго, што ў выпадку адкрытага выступлення супраць такіх планаў, ён першым падзе ахвяраю, Іосіф абраў іншы план. Ён прапанаваць цягнуць жэрабя – той, хто выцягне першы, будзе пазбаўлены жыцця наступным паводле чаргі, і так далей, як вырашыць лёс. «Такім чынам, ніхто не памрэ ад сваёй уласнай рукі, і ганебна паступіць той, хто пасля смерці ўсіх астатніх раптам перадумае і ўратуе сваё жыццё», – заключыў Іосіф [7, с. 226]. Але апроч гэта базавай устаноўцы па жэрабя, у творы Іосіфа Флавія не быў апісаны прынцып размяшчэння гатовых на самагубства. Склалася ўстойлівае меркаванне, што яны размясціліся па колу і вырашылі забіваць кожнага трэцяга з жывых да той пары, пакуль не загінуць усе, апроч аднаго воіна, які ў канцы сам здзейсніць акт самагубства. Мы памятаем, што Іосіф Флавій выжыў («ці дзякуючы ўдачы, ці паводле Божага провіду»), таксама жывым застаўся яшчэ адзін чалавек, якога аўтар пераканаў адмовіцца ад ідэі забойства і самазабойства. Існуюць матэматычныя падлікі, якія паказваюць, што за месцы павіны мусілі займаць абодва іўдзейскія ваяры, якія засталіся жывымі з 41-га – гэта павінны былі быць месцы 31 і 16 [2, с. 43].

### 4-2. Матэматычныя мадэлі

На грунце разважанняў Іосіфа Флавія і спробаў пошуку выхаду з тупіковых сітуацый праз падлікі, у матэматыцы ўзнікла адпаведная задача, названая ў гонар іўдзейска-рымскага гістарыёграфа. У XVII ст. разам з цікавасцю да дакладных навук узнікае і цікавасць да тэорыі лічбаў [10, с. 70]. Упершыню задачу сфармуляваў ў 1612 г. французскі матэматык і лінгвіст Клод Гаспар Башэ дэ Мезіріяк у сваёй працы пад красамоўнай назвай «Прыемныя і захапляльныя задачы, якія складаюцца з лічбаў, часткова сабраныя ў розных аўтараў і зноў вынайдзеныя» (другое выданне выйшла ў 1624 г.) [18]. Пры фармуляванні задачы Башэ напрамую спасылаецца на Кнігу III «Іўдзейскай вайны» Іосіфа Флавія (*la «Guerra de Hierusalem»*) [19, p. 120–121]. Башэ сам даследаваў пытанне пра цэльнае чыславое рашэнне [17, с. 171].

У больш агульнай фармулёўцы задача выглядзіць наступным чынам: *n* чалавек, пранумараваных ад 1 да *n*, размяшчаюцца па колу ў кірунку гадзіннікавай стрэлкі, пры гэтым кожны *q*-ы выбывае з кола. Неабходна вызначыць, хто ж застанецца апошнім. Гэтая задача не такая простая, як можа падацца на першы погляд, і ў поўным аб'ёме яна не вырашана да сённяшняга моманту [1, с. 22]. Размесціць усіх людзей так, каб *n* канкрэтных асобаў былі абраныя ў пэўным парадку адзін за адным, падобна што, немагчыма [2, с. 47]. Задача Іосіфа Флавія стала класічнай для камбінаторыкі – таго раздзелу дыскрэтнай матэматыкі, у якім вывучаюцца камбінацыі, якія складаюцца з нейкага концага мноства аб'ектаў адвольнай прыроды. Задача натхніла польска-амерыканскага матэматыка Станіслава Улама на стварэнне паняцця «шчаслівага чысла» [23, p. 125], а сам інструмент з тэорыі лічбаў было прапанавана называць рэшатам Іосіфа Флавія, з-за аналогіі з задачай Іосіфа Флавія [24, p. 117–122]. Для рашэння задачы выкарыстоўваюцца як пераборныя рашэнне, так і рэкурсіўныя, калі апісанне працэсу адбываецца ўнутры самога сабе.

Рэкурэнтныя суадносіны дазваляюць вылічыць усякі наступны элемент паслядоўнасці, калі зададзеныя яго папярэднія элементы [11, с. 315], робіць магчымым пабудаваць табліцу для невялікіх значэнняў *n*, дзе *J(n)* – нумар ацалелага [3, с. 29]:

**Табліца 1**

*Вынікі рашэння задачы Іосіфа Флавія для невялікіх значэнняў*

| *n* | 1 | 2 3 | 4 5 6 7 | 8 9 10 11 12 13 14 15 | 16 |
|---|---|---|---|---|---|
| *J*(*n*) | 1 | 1 3 | 1 3 5 7 | 1 3 5 7 9 11 13 15 | 1 |

Рашэнне задачы Іосіфа Флавія магчыма праілюстраваць і графічнымі (колавамі) графікамі (паводле: [3, с. 27–28]):




**Мал. 1.** *Кола з 10 жаўнераў, у якім кожны другі павінен «памерці»*




**Мал. 2.** *1-ы этап выдалення*




**Мал. 3.** *2-і этап выдалення*




**Мал. 4.** *3-і этап выдалення*

**4-3. Пераклад «Іўдзейскай вайны»**

Матэматыкі адзначаюць, што сам Іосіф Флавій у пэўным сэнсе не выразна апісаў эпізод з калектыўным суіцыдам у пячоры пад Іатапатай [3, с. 26]. Параўнанне з лацінскімі версіямі перакладу дазваляе прыйсці да меркаванне, што гэты эпізод быў узяты з ранняга (грэкамоўнага) рукапісу тэксту, змест якога захаваўся ў перакладзе, які характарызаваўся як старажытнарускі [3, с. 736, спас. 197]. Гэты так званы старажытнарускі варыянт у сапраўднасці дайшоў да нас у больш чым 30 спісах XV–XVIII стст., якія прадстаўлены дзвюма рэдакцыямі: Хранаграфічнай і Асобнай [9, т. 1, с. 7]. Хранаграфічная рэдакцыя, у сваю чаргу, прадстаўлена дзвюма спісамі: Архіўскім хранографам XV ст. і Віленскім хранографам XVI ст.

Віленскі Хранограф захоўваўся ў былой Віленскай Публічнай бібліятэцы (сёння – у Аддзеле рукапісаў Бібілятэкі Акадэміі навук Літвы імя Урублеўскіх) [25, F19–109]. «Гісторыя Іўдзейскай вайны» Іосіфа Флавія

складае канец кнігі, арк. 500–736. Як паведамляў Флавіян Добранскі, рукапіс паступіў з Супрасльскага манастыра [4, с. 246–255]. Віленскі хранограф утрымлівае цалкам увесь твор у супрацьлегласць усім іншым спісам [12, с. 29]. М. А. Мяшчэрскі меркаваў, што старажытнарускія пераклады базуюцца на нейкіх спісах грэцкага тэксту, якія бытавалі на Усходзе, у Візантыі, і не дайшлі да нас. У той час, як агульнапрыняты грэцкі тэкст узыходзіць да заходніх рукапісаў [12, с. 47].

Грэх самагубства паводле Іосіфа Флавія ў перакладзе выглядаў наступным чынам:

*«Саморѣзание же кромѣ естьства есть и вдано никому животну*

*И пакы иже на ся возложивша рукы, то душа их адъ темныи приемлеть. Отъць же и богъ и до правнукъ мучить их. Тѣмь возненавидѣно се пред богомъ. И закогодавецъ нашь повелѣ до захожениа сълньчьнаго лѣжати без погребениа тѣлесомъ самоубиецъ. По инѣмь же землямь и десница мертвых отрѣзають. По инѣмь же землямь и десница мертвх отрѣзають. Достоини есмы, о друзи, с правдою ходити, а не приложити к напастем человѣчьским гнѣва зиждителева. Се моея рѣчи конец! Не могу прѣдатель собѣ быти! Иноплѣменнници зовуть нас на спасение! Аз ли хочю на мечь налечи? Не буди ми се! Аще же и по вдании рукы убиють мя, то яко вѣнцем побѣдным вѣнчанъ отиду, имѣя невѣрство их луче цесарства!»* [12, с. 309].

У пераказе ж эпізоду самагубства ўзмоцнена гучыць тэма забойства кожнага другога (Кн. 3, Гл VIII, 7):

*«И сеи, поручив спасение свое богу-строителю, рече: Поне же благоволилъ богъ умрѣти нам, числом да убиени будем, на него же конецъ числа будеть, да тот будеть убиенъ от втораго! Тако рекъ, почте числа мудростию и тем прѣбляди вся. И убиени быша вси друг от друга, развѣ единаго. И тъмняся, да не осквернить десница кровию сродническою, помолися тому, и оба вынидоста жива»* [12, с. 310].

Варта адзначыць, што Віленскі Хранограф з’яўляецца кампіляцыяй па сусветнай гісторыі і ахоплівае перыяд ад стварэння Свету да І ст. н. э. Як і Архіўскі спіс, Віленскі Хранограф узыходзіць да архетыпу – хранаграфічнаму зводу, як мяркуецца, сярэдзіны XIII ст. (умоўная дата – 1262 г., альбо 1352 [16, с. 279–282]). Побач з хранаграфічныя рэдакцыі «Іўдзейскай вайны» Іосіфа Флавія ў Віленскі Хранограф увайшлі таксама іншыя крыніцы: «Шасцідзён» Іаана экзарха Балгарскага, гутаркі на тэму Кнігі Быцця Іаана Златавуста, Біблейскіх кніг (амаль цалкам – Кнігі Быцця, Зыходу, Левіт, Лічбаў, Другазаконне, Ісуса Навіна, Суддзяў, Руф, 1–4 Кнігі Царстваў, а таксама фрагменты з шэрагу прарочых кніг

і Евангелій), Хронікі Іаана Малалы (кн. 1, 2, 4–10), фрагменты з Хронікі Георгія Амартола [15, с. 476]. У склад Віленскага Хранографа ўвайшоў поўны тэкст «Александрыі». Гэты пералік сведчыць, якім корпусам тэкстаў валодаў старажытнарускі кніжнік XIII ст. Адзіны спіс Віленскага Хранографа, які паходзіць з Супрасльскага манастыра, датуецца не пазней сярэдзіны XVI ст. [13, с. 385] і сведчыць пра кола тэкстаў, якія траплялі ў сферу цікавасці ў манаскіх кірылічных скрыпторыях ВКЛ.

**Высновы**

Аналіз прыкладаў такога сацыяльна-псіхалагічнага феномена, як калектыўны суіцыд у вельмі розных грамадствах Антычнасці і Сярэднявечча дазваляе зрабіць некалькі высноваў, якія аб’ядноўваць прыведзеныя вышэй выпадкі:

1. Усе адзначаныя выпадкі калектыўнага суіцыду адбываліся ў фінальнай стадыі працяглага і жорсткага палітычнага і ваеннага супрацьстаяння.

2. Актарамі выступалі прадстаўнікі знешніх, замежных сілаў. Унутраныя канфлікты, як у выпадку з «Югурцінскай вайной» у Нумідзіі, маглі выкарыстоўвацца пад час наступу знешніх сілаў.

3. Адной з умовай здзяйснення такога радыкальнага чыну, як калектыўны суіцыд, з’яўляецца вымушанае знаходжанне ў замкнёнай, ізаляванай прасторы, напрыклад, у замку ці фартэцыі пад час аблогі. Сама аблога магла быць не вельмі працяглай, у адрозненні ад самога працэсу супрацьстаяння.

4. Відавочным наступствам капітуляцыі для тых, хто знаходзіўся ў аблозе, было б поўнае юрыдычнае бяспраўе (рабства) ці вымушаная змена веры.

5. Кансалідаваныя групавыя дзеянні радыкальнага характару робяцца магчымымі, калі сярод абаронцаў прысутнічае моцны фармальны ці нефармальны лідар, альбо падзеі адбываюцца пад эгідай легітымнага ўладара.

6. Традыцыя суіцыдалогіі, закладзеная яшчэ Эмілем Дзюркгеймам, зводзіць матывацыю суіцыду да згубных уздзеянняў сацыяльнага асяроддзя [6, с. 58]. Ваенныя самагубствы Дзюркгейм адносіў да тыпу альтруістычнага суіцыду [6, с. 111]. Але пад гэты аналіз не траплялі менавіта калектыўныя самагубствы. Таму прапануецца вылучыць іх у асобную катэгорыю «гераічных самагубстваў».

Асобных каментароў заслугоўваюць рэлігійныя і ідэалагічныя аспекты падзей. І тут карціне не такая аднастайная. Мы нідзе не бачым

рэлігійнай санкцыі на суіцыд. Толькі адзін выпадак, пад Піленамі, можна разглядаць як самагубства з удзелам паганскай жрыцы, але гэтая можа быць інтэрпрэтацыяй сярэднявечнага гісторыяпісання. У выпадку ж з іўдаізмам прысутнічае прамая забарона на самагубства. Менавіта гэтая рэлігійная забарона прымусіла абаронцаў Масады ўводзіць працэдуру жэрабя і здзяйсняць забойства сваіх супляменнікаў па чарзе.

Аналіз наратываў пра калектыўны суіцыд дазваляе вылучыць як супольныя, так і ўнікальныя рысы ў падобных наратывах. Нягледзячы на наяўнасць у наратывах сістэмы тропаў, якія прыводзяць да ўзмацнення вобразнасці і выяўленчасці, на базе тэксталагічнага аналізу можна сцвярджаць, што падобныя здарэнні мелі гістарычны характар. Дэталі ўнікальнага характару дазваляюць прызнаць рэальнасць падобных выпадкаў, з улікам той наратыўнай схемы, якая выкарыстоўвалася пад час апісання гэтых падзей. Спасылкі на аналагі прадстаўнікамі гісторыяпісання Сярэднявечча і ранняга Новага часу ў дадзеным выпадку таксама працуюць на прызнанне верагоднасці падзей.

## Спіс літаратуры

1. Алексеев, М. А. Задача Иосифа Флавия / М. А. Алексеев // Империя Математики. – 2001. – № 2. – С. 22–28.

2. Болл, У. Математические эссе и развлечения. / У. Болл, Г. Коксетер. – М.: Мир, 1986. – 474 с.

3. Грэхем, Р. Л. Конкретная математика. Математические основы информатики / Р. Л. Грэхем, Д. Э. Кнут, О. Поташник. – 2-е изд. – М.; СПб.; Киев: Вильямс, 2015. – 781 с.

4. Добрянский, Ф. Описание рукописей Виленской Публичной библиотеки, церковнославянских и русских / Ф. Добрянский. – Вильна: Типография А. Г. Сыркина, 1882. – LV + 533 с.

5. Догерти, М. Великие сражения Библейских времен, 1400 г. до н. э. – 73 г. н. э. / М. Догерти, М. Хэскью, Ф. Джэстайс, Р. Райс. – М.: Эксмо, 2009. – 222 с.

6. Дюркгейм, Э. Самоубийство: Социологический этюд / Э. Дюркгейм. – М.: Мысль, 1994. – 399, [1] с.

7. Иосиф Флавий. Иудейская война / пер. с древнегреч. М. Финкельберг и А. Вдовиченко, под ред. А. Ковельмана. – Иерусалим: Гешарим; М.: Мосты культуры, 2017. – 554 с.

8. Иосиф Флавий (Йосеф, сын Маттитьяху). Иудейская война / пер. с древнегреч. М. Финкельберг и А. Вдовиченко, под ред. А. Ковельмана. – М.: Еврейский университет; Иерусалим: Гешарим, 1993. – 510 с.

9. «История Иудейской войны» Иосифа Флавия: Древнерусский перевод / изд. подгот. А. А. Пичхадзе [и др.]. – Т. 1–2. – М.: Языки славянской культуры, 2004.

10. История математики с древнейших времен до начала XIX в. / под ред. А. П. Юшкевича. – Т. 2: Математика XVII ст. – М.: Наука, 1970. – 300 с.

11. Матэматычная энцыклапедыя / гал. рэд. В. Бернік. – Мінск: Тэхналогія, 2001. – 496 с.

12. Мещерский, Н. А. История Иудейской войны Иосифа Флавия в древнерусском переводе / Н. А. Мещерский. – М.; Л.: Наука, 1958. – 580 с.

13. Мещерский, Н. А. К вопросу о датировке Виленского хронографа / Н. А. Мещерский. – Труды Отдела древнерусской литературы. – Т. 11. – 1953. – С. 380–386.

14. Саллюстий, Гай Крисп. Заговор Катилины. Югуртинская война / пер. со вступ. ст. Н. Б. Гольденвейзера. – М.: М. и С. Сабашниковы, 1916. – XXVI, 180, [6] с.

15. Словарь книжников и книжности Древней Руси / отв. ред. Д. С. Лихачев. – Вып. 1 (XI – первая половина XIV в.). – Л.: Наука, 1987. – 492, [2] с.

16. Толочко, А. О дате так называемого Иудейского хронографа / А. Толочко // Ruthenica. – XV. – 2019. – С. 279– 282.

17. Цейтен, И. Г. История математики в древности и средние века / И. Г. Цейтен. – Изд. 3-е, доп. – М.: URSS, 2019. – 231 с.

18. Bachet, C. G. Problèmes plaisans et délectables, qui se font par les nombres, partie recueillis de divers autheurs, et inventez de nouveau, avec leur démonstration, par Claude Gaspar Bachet, Sr. de Méziriac. Très utiles pour toutes sortes de personnes curieuses qui se servent d'arithmétique / C. G. Bachet. – Lyon: P. Rigaud, 1624. – [14], 248 p. (Перавыданне: Paris: A. Blanchard, 1993).

19. Bachet, C. G. Problèmes plaisants et délectables qui se font par les nombres / Cinquième édition revue, simplifiée et augmentée / C. G. Bachet. – Paris: Gauthier-Villars, 1884. – 242 p.

20. Cotton, H. M. The Date of the Fall of Masada: The Evidence of the Masada Papyri / H. M. Cotton // Zeitschrift für Papyrologie und Epigraphik. – Bd. 78. – 1989. – S. 157–162.

21. Cotton, H. M. The Impact of the Documentary Papyri from the Judaean Desert on the Study of Jewish History from 70 to 135 CE. / H. M. Cotton // Jüdische Geschichte in hellenistisch-römischer Zeit. Wege der Forschung: Vom alten zum neuen Schürer / hrsg. von A. Oppenheimer. – Oldenbourg: Wissenschaftsverlag, 2018. – S. 221–236.

22. Cromeri, Martini. De origine et rebus gestis Polonorum libri 30. Tertium ab authore diligenter recogniti. Funebris eiusdem autoris oratio, Sigismundi regis uitam compendiosècomplexa, & aliquoties iam prius edita. Accessit iudicium Francisci Robortelli Vtinensis, de authore &. / M. Cromeri. – Basileae: ex officina Oporiniana, 1568. – [12], 468, [64] p.

23. Dowdy, J. Josephus Permutations / J. Dowdy, M. E. Mays // Journal of Combinatorial Mathematics and Combinatorial Computing. – 1989. – V. 6, October. – P. 125–130.

24. Gardiner, V. On certain sequences of integers defined by sieves / V. Gardiner, R. Lazarus, N. Metropolis, S. Ulam // Mathematics Magazine. – 1955. – V. 29:3. – P. 117–122.

25. Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka. Rankraščių skyrius (Бібілятэка Акадэміі навук Літвы імя Урублеўскіх. Аддзел рукапісаў). – F19–109 (“Віленскі Хранограф”).

26. Miechow, M. Chronica Polonorum / M. Miechow. – Cracoviae: Vietor, 1521. – [24], 379 s. (фотаграфічнае перавыданне: Kraków: Krajowa agencja wydawnicza, 1986).

27. Roth, J. The Length of the Siege of Masada / J. Roth // Scripta Classica Israelica. – Vol. XIV. – 1995. – P. 87–110.

28. Sallusti, Gaius Crispi. Catilina, Iugurtha, Orationes Et Epistulae Excerptae De Historiis / G. C. Sallusti; hrsg. von A. W. Ahlberg. – Leipzig: Teubner, 1919. – 170 S.

29. Stryjkowski, M. Ktora przedtym nigdy światła nie widziała Kronika Polska, Litewska, Zmodzka, y wszystkiey Rusi Kijowskiey, Moskiewskiey, Siewierskiey, Wołynskiey, Podolskiey, etc. Y rozmaite przypadki woienne y domowe, Pruskich, Mazowieckich, Pomorskich, y inszych krain Krolestwu Polskiemu y Wielkiemu Xięstwu Litewskiemu przyległych, według istotnego y gruntownego zniesienia pewnych dowodow z rozmaitych Historikow y Autorow postronnych, y domowych, y Kijowskich, Moskiewskich, Sławańskich, Liflantskich, Pruskich starych, Dotąd ciemnochmurną nocą zakrytych Kronik, y Latopisczow Ruskich, Litewskich, y Dływgosza Oyca dzieiow Polskich z inszymi, z wielką pilnością y węzłowatą pracą (Osobliwie około Dzieiow Litewskich y Ruskich od żadnego przedtym niekuszonych) Przez Macieia Osostewiciivsa triykowskiego dostatecznie napisana, złożona, y na pierwsze swiatło z wybadanim prawdziwie dowodney starodawności własnym wynalezienim, przeważnym dochcipem, y nakładem nowo wydzwigniona przez wszystki starożytne wieki, aż do dzisieyszego Roku 1582. A tu przod wszystkich ile ich kolwiek iest ludzkich na Swiecie Narodow gruntowne wywody. Z łaską y Priwileiem Kro: J: M: – Drukowano w Krolewcu v Gerzego Ostenbergera: M.D.LXXXII. – Fol., k. tyt. i k. 20 nlb.; str.1+791.

30. Yadin, Y. Masada. Herod’s Fortress and the Zealots’ Last Stand / Y. Yadin. – London: Weidenfeld and Nicolson, 1989. – 272 p.

31. Wigand von Marburg. Nowa kronika pruska / opr. S. Zonenberg, K. Kwiatkowski. – Toruń: TNT, 2017. – 666 s.



**Ілюстрацыя 1.** *Уладзіслаў Канстанцін Маераноўскі (1817–1874) “Апошняя сцэна Маргера”. Візія трагедыі ў катэгорыя рамантызму*




**Ілюстрацыя 2.** *План Масады ў рымскай аблозе (паводле: Roth, Jonathan. The Length of the Siege of Masada // Scripta Classica Israelica. Vol. XIV. 1995. P. 110)*



**Ілюстрацыя 3.** *Тры чарапкі глінянага посуду (астраконы) з надпісамі, выяўленыя пра раскопках Масады. Верхні астракон: імя “Yehohanan”; грэцкая літара Альфа і палеагабрэйскае напісанне літары Йод. Астракон ніжні злева: імя “Yehuda”; грэцкая літара Бэта, напісаная справа налева; палеагабрэйскае напісанне літары Самех. Астракон ніжні справа: імя “Shimeon”; палеагабрэйскае напісанне літараў Далет і Гімель (паводле: Yadin, Yigael. Masada. Herod’s Fortress and the Zealots’ Last Stand. London, 1989. P. 190)*



**Ілюстрацыя 4.** *Імя “Ben Ya’ir”, напісаных на адным з астраконаў, выяўленых у Масадзе. Верагодней за ўсё, належала Элізару Бэн Яіру, правадыру зілотаў Масады (паводле: Yadin, Yigael. Masada. Herod’s Fortress and the Zealots’ Last Stand. London, 1989. P. 201)*